Чакаюць дыпломных распрацовак тэмы народных і шляхетных строяў, гістарычных падзей і інш.

Абагульняючы сказанае, адзначым, што мы маем падставу гаварыць аб архетыпах. Паводле тэорыі К.Г.Юнга, архетып — гэта праваобраз, знак будучай пабудовы. Ён нагадвае восі крышталізацыі рэчыва. Як у спрыяльных умовах утвараецца крышталь, так і ў розных народаў — аднолькавыя сюжэты казак, архаічная сімволіка, філасофскія думкі.

Такім чынам, сёння мы назіраем адраджэнне архетыпаў, якія прыводзяць шмат людзей у Беларусі да заняткаў выразання папяровых узораў.

Трэба заўважыць, што ў нас досыць высокая графічная культура, якая ідзе яшчэ з часоў Ф.Скарыны. Выцінанка шмат у чым нагадвае гравюры на дрэве: тыя ж напружанне, барацьба паміж чорным і белым, паміж фонам (хаосам) і формай (праяўленнем). Таму і майстэрства гэта, раз з'явіўшыся, пераժыўшы заняпад, зноў адраджаецца, яно не згіне, не згубіцца ў часе, бо гэта частка нашай душы.

С.В.Строгіна,
*нам. дырэктара Магілёўскага абласнога мастацкага музея*

## ЗАХАВАНАЯ СПАДЧЫНА

Традыцыйна экспанаты арганізаваных яшчэ ў XIX ст. Магілёўскага музея (1867) пры губернскім статкамітэце і Магілёўскага царкоўна-археалагічнага музея (1897) звязаны з мясцовым краем, яго мастацтвам і культурай.

Наш край на працягу стагоддзяў даваў беларускай культуры таленавітых майстроў-рэзчыкаў па дрэве і іканапісцаў: Клім Міхайлаў, Восіп і Сцяпан Івановы, Якаў Магілёвец і Пётр Фёдараў. Вядомы помнікі іканапісу з Басценавіч, Галынца, Быхава. Магілёўская школа гравюры XVII ст. знайшла сваё ўвасабленне ў данесеных да нас творах Фёдара Ангілейкі, Васіля і Максіма Вашчанкаў.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Будынак Магілёўскага абласнога мастацкага музея з'яўляецца помнікам архітэктуры пачатку XX ст. Ён пабудаваны з цэглы, мае рысы стыляў мадэрна, псеўдарускага і позняга класіцызму. Двухпавярховы (з невысокім цокальным паверхам), Т-падобны будынак мае асіметрычную кампазіцыю. Галоўны фасад у ім расчленены двума рызалітамі. Адзін з іх мае шатровае завяршэнне, аздоблены шчытом у выглядзе какошніка з разеткай у цэнтры, другі вырашаны ў выглядзе дзвюхяруснай вежы, завершанай нізкім шатровым дахам. Вокны ў будынку прамавугольныя і арачныя. У дэкаратыўным аздабленні музея выкарыстаны рустыка цоколя, прафіляваныя архівольты какошнікаў, несапраўдныя машыкулі, дэкаратыўныя ўстаўкі ў выглядзе разетак у прамавугольных рамках, паўкалонкі з ляпнымі кампазіцыйнымі капітэлямі, паяскі, раслінны арнамент. Планіроўка калідорная і галерэйная, з лесвіцамі ў тарцах. Аўтар праекта — А.Друкер, архітэктар — П.Камбураў. Будаўніцтва музея завершана ў 1914 г. Тады ў ім размяшчаўся зямельна-сялянскі банк. У лістападзе 1917 г. пасля захопу царскай стаўкі ў Магілёве чырвонаармейцамі ў будынку банка выдавалася бальшавіцкая газета "Рэвалюцыйная стаўка". У маі 1919 г. будынак быў перададзены аддзелу народнай адукацыі для адкрыцця ў ім музея пралетарскай культуры. З гэтага часу і на працягу 13 гадоў (да мая 1932 г.) тут знаходзіўся Магілёўскі дзяржаўны гістарычны музей. У музеі на той час захоўвалася звыш 4000 разнастайных рэчаў. Звяртаюць увагу плашчаніца 1566 г. Чарэйскага манастыра і першадрукаваная мінея 1490 г. Напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны ў фондасховішчы музея захоўваліся экспанаты вялікай культурна-гістарычнай каштоўнасці: крыж Ефрасінні Полацкай (1161), калекцыі рукапісных кніг і грамат (175 адзінак), зброі X—XIV стст. (280 адзінак), манет (18 тыс. адзінак), шмат абразоў XIII—XVIII стст., карціны І.Айвазоўскага, І.Рэпіна, В.Сярова і інш. У 1941 г. калекцыя была вывезена з Магілёва, і на сённяшні



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дзень яе месцазнаходжанне невядома. З 1945 г. па 1990 г. памяшканне выкарыстоўвалася як адміністрацыйны будынак.

Магілёўскі абласны мастацкі музей заснаваны ў адпаведнасці з законам Рэспублікі Беларусь “Аб музеях і музейным фондзе Рэспублікі Беларусь”, адкрыты рашэннем выканаўчага камітэта Магілёўскага абласнога Савета дэпутатаў (№ 13—8) ад 19 лістапада 1990 г. Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 22 студзеня 1996 г. Магілёўскаму абласному музею прысвоена імя народнага мастака РБ П.В.Масленікава.

У музеі створаны і дзейнічаюць фондава-закупачная камісія, навукова-метадычны і рэстаўрацыйны саветы.

Агульная плошча музея — 5 тыс. кв. м., экспазіцыйна-выставачная плошча — 0,7 тыс. кв. м., плошча фондасховішчаў — 0,2 тыс. кв. м. У музеі 2 тыс. экспанатаў асноўнага фонду (1999): графіка, жывапіс, іконы, старадрукі, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва, скульптура.

Калекцыя музея ў большасці сваёй — гэта творы сучаснага мастацтва Беларусі, мастакоў, якія нарадзіліся або жылі, зараз жывуць і працуюць у Магілёве і Магілёўскай вобласці (Л.Асецкі, Ул.Кудрэвіч, В.Грамыка, Ул.Стальмашонак, М.Беляніцкі, П.Масленікаў, Л.Марчанка, Ф.Кісялёў, М.Федарэнка, Ул.Шпартаў, Г.Кананава, М. і Р.Таболічы, В. і В.Юрковы, А.Мацievіч, А.Малішэўскі і інш.). У зборы музея і творы знакамітых мастакоў рэспублікі: М.Савіцкага, Л.Шчамялёва, Р.Вашчанкі, Ул.Кожуха, А.Анікейчыка, А.Бембеля, З.Азгура, Ул.Лятуна і інш.

1 верасня 1997 г. у музеі была адчынена пастаянная экспазіцыя карціннай галерэі П.В.Масленікава, размешчаная ў чатырох залах на другім паверсе. У першай зале — творы, звязаныя з пачаткам творчай дзейнасці мастака ў Нацыянальным тэатры оперы і балета ў Мінску: эскізы дэкарацый да опер і балетаў, эскізы касцюмаў да тэатральных пастановак (1938—1941, 1946—1960). У другой



РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

зале знаходзяцца пейзажы, прысвечаныя мясцінам Беларусі. Экспазіцыю трэцяй залы складаюць шматлікія пейзажы, звязаныя з вандроўкамі мастака ў Крым, Прыбалтыку, на Алтай. У чацвёртай зале — экспазіцыя ўласных рэчаў, мэблі, эцюдаў, карцін, апошні недапісаны твор мастака “Нябёсы”.

У экспазіцыі 115 карцін, эскізаў дэкарацый і касцюмаў, 57 асабістых рэчаў мастака і прадметаў быту. У фондах галерэі каля 400 экспанатаў.

Музей — гэта навукова-даследчая і культурна-асветная ўстанова. За час існавання музея ў яго выставачных залах арганізавана вялікая колькасць перасоўных і асабістых выстаў: нямецкай графікі, сучаснай графікі Ізраіля, твораў М.Рэрыха (з Міжнароднага фонду Рэрыхаў у Маскве), кітайскага мастацтва (з Музея гісторыі г. Тайбэй), сучаснага беларускага мастацтва (з Музея сучаснага мастацтва, г. Мінск) і інш.

Добрай традыцыяй стала праводзіць на базе музея міжнародныя пленэры па жывапісе. У 1996 г. і 1997 г. адбыліся пленэры, прысвечаныя В.К.Бялыніцкаму-Бірулі, а ў 1998 г. — памяці Мікалая Неўрава, затым была аформлена творчая справаздача мастакоў.

Пасля завяршэння рэканструкцыі і рэстаўрацыі музея плануецца адкрыццё пастаяннай экспазіцыі старажытнабеларускага мастацтва “Захаваная спадчына”.

Да адкрыцця гэтай экспазіцыі трэба закончыць рэстаўрацыю фрэсак з Бялыніцкага кляштара “Ператварэнне Гасподняе” і “Сон Іаакава”.

Касцёл кармеліцкага кляштара ў Бялынічах уяўляў сабой трохнефавую крыжова-купальную базіліку з фігурным франтонам і тыповымі барочнымі валютамі на фасадзе. Інтэр’ер касцёла, а таксама кляштарнай пабудовы быў распісаны. Размалёўка мелася на скляпенні, сценах, а таксама дзвярах.

Дзякуючы супрацоўнікам рэстаўрацыйных майстэрняў, нам пашчасціла пазнаёміцца з асобнымі кампазіцыямі, знятымі ў 1978—1979 гадах у сувязі з аварыйным станам будынка.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

На прасторавае вырашэнне роспісаў магічнае ўздзеянне аказвае плоскасць сцяны. Так, на фрэсцы “Ператварэнне Гасподняе” дзеянне разгортваецца ў адным прасторавым слаі, набліжаным да гледача.

На падставе запісаў у прыходна-расходнай кнізе Бялыніцкага кармеліцкага кляштара, якая знаходзіцца ў архіве цэнтральнага кляштара ў Вільнюсе, датаванне роспісаў аднесена да 1761 г. Згодна з імі, у гэтым годзе мастак манах Іосіф, відаць, з памочнікамі атрымаў да 1680 злотых.

Вялікую цікавасць сярод багатай інфармацыі ўяўляе рукапіс на некалькі дзесяткаў старонак, ён адносіцца да 1693 г. (архіў Кракаўскага кармеліцкага кляштара) і дае спіс жывапісных твораў. Першым у ліку выяў, якія знаходзіліся ў алтары і ўвогуле ў касцёле, пазначаны Obraz stary Coronationis. Трэба адзначыць, што ў кармеліцкім асяроддзі на ўсходзе Беларусі невядомы іншы цудатворны абраз, акрамя Маці Боскай Бялыніцкай.

Як сведчыць даследчык гісторыі ордэна кармелітаў Я.Пжыцкі, бялыніцкі абраз вядомы з 1634 г. выпадкамі звышнатуральнага ўздзеяння. У 1635 г. маршалак Вялікага княства Літоўскага Кшыштаў Завіша зрабіў для яго карону. З 1655 г. па 1760 г., па звестках таго ж гісторыка, абраз знаходзіўся ў Ляхавічах. Але не выключана, што напрыканцы ХУІІ ст. ён мог знаходзіцца і ў Магілёўскім кляштары, а ўжо к 1755 г., калі, як сведчаць дакументы архіва кармеліцкага кляштара ў Кракаве, у Бялынічах разглядалася справа аб праўдзівасці цудаў ад яго.

На жаль, у калекцыі музея гэтага абраза няма, але ёсць не менш каштоўны экспанат—кніга “Неба новае”, выданая брацкай друкарняй у 1699 г. Праз тры стагоддзі гэтая кніга данесла да нас непаўторны дух далёкай эпохі. У ёй апісаны цуды абраза Маці Боскай Бялыніцкай. Друкарня размяшчалася ў Богаяўленскім манастыры ў Магілёве, пабудаваным у 1633—1636 гг. Богаяўленскі манастыр з’яўляўся ў свой час цэнтрам культурнага і рэлігійнага жыцця Магілёва.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Карэнны жыхар Магілёва Максім Вашчанка атрымаў адукацыю ў Вільні. 21 лістапада 1672 г. ён здаў экзамены на ступень бакалаўра філасофіі і свабодных мастацтваў. А ў наступным годзе атрымаў званне магістра навук, працаваў у друкарні Кіеўскага праваслаўнага брацтва, затым у Куцеінскай друкарні і Буйнічах, а потым зноў вярнуўся ў Магілёў.

Да першых работ майстра адносяцца 16 гравюр на медзі, выкананых для кнігі "Манархія турэцкая, апісаная Рыко" (друкарня ў Слуцку, 1678 г.). З 1680 г. ім было зроблена каля 20 выданняў, шмат якія аздоблены гравюрамі з выявамі сцэн з Біблii, канцоўкамі, застаўкамі і вялікімі літарамі.

Найбольш багата была аздоблена кніга "Акафісты і каноны" (Магілёў, 1693), у якой было больш за дваццаць гравюр.

У 1669 г. брацтва Богаяўленскага манастыра заклала Мікалаеўскі кляштар. Прыёмы, якія былі выкарыстаны пры будаўніцтве Богаяўленскага сабора, атрымалі далейшае развіццё і ўдасканаленне, а архітэктурны воблік храма набыў самастойнасць і выразнасць. У кляштары ўдала спалучаецца дэкор галоўнага фасада з убраннем інтэр'ера, якое перш за ўсё вызначана разным іканастасам. Драўляны іканастас па тонкасці выканання і складанасці формаў з'яўляецца выдатным творам беларускіх майстроў.

Фрагменты іканастаса ў фондах музея даюць магчымасць цікава прадставіць тэму "Магілёўскія майстры-разьбяры па дрэве XVI—XVII стст."

Чатырохярусны іканастас падзелены разнастайнымі карнізамі. Асноўнымі матывамі іканастаса з'яўляюцца разьбяныя калоны з дрэва і разьбяны арнамент з раслінных парасткаў, лістоў і вінаградных лоз — аблюбаваны матыў барока. Іканастас выкананы мясцовымі майстрамі да 1672 г. Ёсць звесткі,што ў стварэнні яго прымаў удзел Клім Міхайлаў, ураджэнец Шклова. Міхайлаў узначальваў арцель разьбяроў па дрэве, якія стварылі новую тэхналогію высокай рэльефнай разьбы з самабытнай мастацкай стылістыкай.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Тое, аб чым мы паведамілі, толькі частка скарбаў Магілёўскага мастацкага музея. Пра ўсё расказаць проста немагчыма. Мы з вялікім задавальненнем сустракаем наведвальнікаў і стараемся, каб яны ўбачылі як мага больш, каб яшчэ мацней любілі сваю родную Беларусь.

А.В.Шаціла,
*аспірантка*

## ГІСТАРЫЧНЫЯ ПЕРШАПРЫЧЫНЫ ЗНІКНЕННЯ САЛАМЯНЫХ ЦАРСКІХ БРАМ

Кожная з'ява культуры і мастацтва мае пад сабою пэўную глебу, і зразумець яе можна толькі ў кантэксце той гістарычнай сітуацыі, у якой яна ўзнікла і развівалася. Шмат рэчаў народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва былі народжаны патрэбамі жыцця і часу. Саламянае ўбранне царкоўнага інтэр'ера — з'ява унікальная, і, наколькі вядома, існавала яна толькі ў Беларусі, аналагаў не сустракаецца ва ўсім свеце.

Да нашага часу захаваліся тры ўзоры саламяных царскіх брамаў: з вёсак Лемяшэвічы і Вавулічы, што на Піншчыне (зараз у Нацыянальным мастацкім музеі), і з Гродзенскага Барысаглебскага манастыра (зараз у Гродзенскім гісторыка-археалагічным музеі). Я.М.Сахута ў сваёй кнізе "Народнае мастацтва Беларусі" называе яшчэ тры брамы. «Саламяная царская брама з вёскі Сваятычы Навагрудскага павета, куды яна трапіла ў 1860-я гады з Піншчыны, зберагалася ў Мінскім царкоўна-археалагічным музеі. У вёсцы Горск на Піншчыне саламянымі былі не толькі царская брама, але і бакавыяківоты. На Мінскай краёвай выстаўцы ў 1918 г. дэманстравалася не толькі саламяная царская брама "з ваколіц Прыпяці", але і дзве кароны для вянчання з пшанічнай саломы» [3, с. 171]. Нават зыходзячы з гэтых звестак, можна зрабіць выснову, што саламянае аздабленне цэркваў — з'ява для Беларусі не адзінкавая.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ